# алімпіец

ЗВЯЗДА

ВЫПУСК № 7 (28)

Сумесны праект газеты «Звязда», Нацыянальнага алімпійскага камітэта і Міністэрства спорту і турызму Рэспублікі Беларусь




■ Ведай нашых!

Кацярына ГАЛКІНА, прызёрка чэмпіянату свету па мастацкай гімнастыцы:

# «ЖОРСТКІЯ ДЫЕТЫ І ЗЛОСНЫЯ ТРЭНЕРЫ Ў ГІМНАСТЫЦЫ — ГЭТА НЕ МІФ»

## ПРА СПАРТЫЎНАЕ ДЗЯЦІНСТВА, СТАЎЛЕННЕ БЕЛАРУСАЎ ДА МАСТАЦКАЙ ГІМНАСТЫКІ І ЯПОНЦА, ЯКІ «ХВАРЭЕ» МЕНАВІТА ЗА БЕЛАРУСЬ

**Цяпер у галоўных грацый нашай краіны ў самым разгары трэніровачны працэс. Старт сезона ўжо не за гарамі — у пачатку наступнага года ён адкрыецца турнірам у Лос-Анджэлесе, а працягнецца, па традыцыі, этапамі Кубка свету і Гран-пры. А вось чэмпіянат Еўропы ў 2015 годзе прыме Мінск. Чым не падстава пазнаёміцца з нашымі «мастачкамі» бліжэй? Наша госця — адна з найлепшых гімнастак Беларусі, майстар спорту міжнароднага класа, неаднаразовы сярэбраны прызёр чэмпіянатаў Еўропы і сярэбраны прызёр чэмпіянату свету 2014 года Кацярына Галкіна.**

### ПРА ДЗЯЦІНСТВА

Ва ўзросце пяці гадоў я сама прыняла рашэнне займацца мастацкай гімнастыкай. Мая энергічнасць не давала нікому спакою. Па тэлебачанні ў дзяцінстве вельмі любіла глядзець спартыўныя спаборніцтвы, калі паказвалі мастацкую гімнастыку або фігурнае катанне, спрабавала паўтараць за спартсменкамі, выробляла ўсякія трукі проста перад тэлевізарам. Бацькі, гледзячы на гэта, не засталіся абыякавымі і вырашылі накіраваць маю энергію ў патрэбнае рэчышча — адвялі ў спартыўную залу, там я і пачала займацца мастацкай гімнастыкай. Тое, што дайду ў сваім захапленні да нацыянальнай каманды, буду выступаць на чэмпіянатах свету і Еўропы, вядома, ніхто не думаў.

Ніякіх перашкод і складанасцяў у дзіцячую пару не адчувалася, але дзяцінства скончылася ў 5 гадоў, з тых часоў думаць пра нешта, акрамя гімнастыкі, я проста не магла. Мастацкая гімнастыка — гэта мая любімая справа, таму мне заўсёды хацелася гэтым займацца. Адзіны мінус — гэта недахоп часу, таму што прысвячаю ўсё гэтай працы. Пераломныя моманты, калі хочацца кінуць спорт, бываюць ва ўсіх, і ў мяне не раз такое бывала.

На сённяшні момант сваім галоўным дасягненнем лічу ўдзел у чэмпіянаце свету, які ў гэтым годзе прайшоў у турэцкім Ізміры. У камандных спаборніцтвах мы сталі другімі. Але на гэтым не спыняюся, а іду наперад. Ужо тое, што стала членам нацыянальнай зборнай, для мяне — велізарны поспех.

### ПРА ГІМНАСТЫКУ

Мастацкая гімнастыка заўсёды была спалучэннем спорту і мастацтва. На гімнастычным дыване пры дапамозе музыкі мы ствараем розныя вобразы. Мне больш за ўсё падабаецца выступаць пад душэўныя, сур'ёзныя кампазіцыі. Гэта, напэўна, трохі адлюстроўвае мой характар — я шмат думаю *(смяецца)*. Перад выступленнем прадумваем макіяж, самі яго робім, як і прычоскі. Трэнер можа толькі параіць, унесці папраўку. А вось купальнікі — гэта сумесная праца швачкі, трэнера і гімнасткі.

Што тычыцца любімых прадметаў у гімнастыцы, вылучаць іх на прафесійным узроўні, на мой погляд, не вельмі правільна, таму што ўсё роўна неабходна выступаць з усімі. Звычайна такія пытанні задаюць у дзіцячым узросце, дык вось у мяне, напрыклад, у дзяцінстве не атрымліваліся практыкаванні з мячом. З ім у мяне былі вялікія праблемы, а потым паступова ўсё наладзілася.

З часам мастацкая гімнастыка мяняецца, 10 гадоў таму, напрыклад, было ўсё зусім па-іншаму. Апошні раз правілы мяняліся два гады таму, тады наш від быў насычаны складанымі тэхнічнымі элементамі, цяпер жа ўсе спрабуюць зрабіць гімнастыку больш зразумелай, успрымальнай для гледача. Уключаюць больш танцавальных крокаў, каб з іх дапамогай паказаць музыку. Сёння хочуць зрабіць нешта сярэдняе, каб у выступленні была і тэхніка, і кампазіцыя. У гэтых зменах няма нічога дрэннага, таму што адно і тое ж нецікава як самім спартсменам, так і гледачам.

### ПРА ЎВАГУ БЕЛАРУСАЎ

Беларускія гімнасткі ўжо даўно не вяртаюцца з буйных міжнародных турніраў без медалёў, але, як бы крыўдна і сумна не было гэта прызнаваць, нашы людзі не вельмі цікавяцца гімнастыкай. Гэта добра было відаць па запаўненні трыбун на этапе Кубка свету, які праходзіў у маі гэтага года ў Мінску. Усё ж такі ў нашай краіне галоўныя віды спорту — гэта хакей і футбол, хоць вынікі там і не вельмі… Вядома, ёсць людзі, якія спрабуюць нам дапамагаць, піярыць, але пакуль гэта не працуе. Я не ведаю, у чым прычына такой незацікаўленасці.

Часта нас не пазнаюць у родным горадзе, але выдатна ведаюць у твар у той жа Італіі або Іспаніі. Гэта не вельмі правільна. Нашы гімнасткі не такія медыйныя асобы, як тыя ж расіянкі. Магчыма, прычына ў гэтым. У нас добра ведаюць Меліціну Станюту. А яна пачынала прасоўваць сябе сама. Яе цяпер актыўна здымаюць у рэкламе, а мне дапамагае адна з буйных касметычных марак.

А наогул у свеце ў нашай зборнай ёсць адзін цікавы прыхільнік. Ён японец. Гэты чалавек прысутнічае на ўсіх буйных міжнародных турнірах. Крычыць з трыбун нам словы падтрымкі, сядзіць з беларускім сцягам, пасля спаборніцтваў можа падысці пагаварыць, усе дзяўчаты яго ведаюць.

Самая прыемная публіка — у Італіі і Іспаніі, там вельмі любяць мастацкую гімнастыку. Цёпла прымаюць не толькі сваіх спартсменак, але і ўвогуле ўсю эліту мастацкай гімнастыкі. Таксама камфортна выступаць у Японіі.

У Мінску нам ужо даўно абяцаюць новы палац, які ўсё ніяк не могуць дабудаваць. Апошні раз казалі, што праз 30 месяцаў ён будзе гатовы, потым зноў што-небудзь здаралася і тэрміны пераносіліся. Гэта балючая тэма для нас. Часам узнікае адчуванне таго, што наша праца нікому не патрэбна.

**Часта нас не пазнаюць у сваёй краіне, у родным горадзе, але выдатна ведаюць у той жа Італіі або Іспаніі. Гэта не вельмі правільна.**

### ПРА ЗБОРНУЮ

Стасункі ў калектыве заўсёды з'яўляюцца важным складнікам поспеху. У нас у камандзе выдатныя адносіны. Усе стараюцца адна адной дапамагчы. Калі нешта не атрымліваецца, трэба ў першую чаргу сесці і абмеркаваць, чаму ўзнікаюць праблемы, а ў другую — працаваць больш старанна. Да гэтага часу памятаю сваю першую трэніроўку ў нацыянальнай камандзе, ніхто коса на мяне не глядзеў. Ды і, ведаеце, калі першы раз трапляеш на такі ўзровень, думаеш толькі аб тым, як зрабіць усё правільна і не расчараваць трэнера.

Мастацкая гімнастыка для мяне — гэта любоў да таго, што ты робіш: мяне заўсёды гэтаму вучылі. Жорсткія дыеты і злосныя трэнеры ў гімнастыцы — гэта не міф. Ну а як па-іншаму? Калі трэнер будзе «добрай цёткай», з гэтага нічога не выйдзе, і гэтак усюды, не толькі ў гімнастыцы. Што тычыцца дыет, вядома, трэба глядзець сябе, гэта адзін з самых галоўных аспектаў. Таму што першае, на што звяртаюць увагу — гэта знешні выгляд. Жорсткія дыеты пераследуюць нас на працягу ўсёй кар'еры.

**Мастацкая гімнастыка для мяне — гэта любоў да таго, што ты робіш, мяне заўсёды гэтаму вучылі.**

### ПРА ХВАЛЯВАННЕ І ЗАБАБОНЫ

Пакуль я не хачу гаварыць пра Алімпіяду ў Рыа, усё ж такі яшчэ шмат часу да гэтай падзеі. Наогул аддаю перавагу не загадваць: гэта жыццё, у ім усё што заўгодна можа адбыцца. Жыву па прынцыпе: «Мы думаем, а Бог робіць».

На кожных спаборніцтвах хваляванне прысутнічае, і ўсюды яно рознае. Спартсмен сам павінен умець сябе настройваць, гэта прыходзіць з вопытам. Калі казаць аб прыкметах, у галаву прыходзіць толькі адна — не вяртацца ў гасцініцу, калі нешта забыў. Мой талісман — гэта мядзведзік, які аб'ездзіў са мной ужо ўвесь свет.

### ПРА СЯБЕ

Наогул лічу, што мой характар можа апісаць толькі блізкі мне чалавек. Самой гаварыць пра гэта, напэўна, няправільна. Назаву, мабыць, толькі некалькі рыс. Па ўсходнім гараскопе я — Бык, таму вельмі упартая. Калі гэта накіроўваецца ў добрае рэчышча — добра, але бывае і не вельмі. Адназначна ўпартасць дапамагае мне ў спорце. З негатыўных назвала б тое, што па натуры я перфекцыяністка. Гэта таксама ў нейкай меры плюс, а ў нейкай — мінус. Можна нейкую працу зрабіць добра, а можна вельмі добра, але асаблівай розніцы відаць не будзе. Тым не менш часу ты патраціш у два ці тры разы больш. Я шмат думаю, бывае карысна выключыць мозг, пайсці паспаць, адключыцца, а мне так шмат думак прыходзіць, усе перадумаю. Складана так жыць *(смяецца)*.

Люблю чытаць, але не заўсёды хапае часу на гэта. Кніга, якая мне вельмі спадабалася, — «Да сустрэчы з табой» Джоджа Моес. Яна мяне ўразіла і прымусіла нават пару разоў заплакаць. Я ўвогуле вельмі люблю кнігі, якія прымушаюць задумацца, якія здольны памяняць твой погляд на жыццё, навучыць чамусьці.

Выхадны ў нас толькі адзін — нядзеля; у гэты дзень займаюся усімі назапашанымі за тыдзень справамі. З прыемнага: люблю сустрэцца з сябрамі, наведаць салон прыгажосці.

У людзях цаню дабрыню, сумленнасць, шчырасць. Мяне могуць прымусіць захапляцца самыя простыя ўчынкі, асабліва раптоўныя, ад чыстага сэрца і ад душы.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ**

■ У фотааб'ектыве

# АДЗІН ЗА ЎСІХ

## СЯРГЕЙ КРЫВЕЦ АТРЫМАЎ УСЕ ГАЛОЎНЫЯ ЎЗНАГАРОДЫ ШТОГАДОВАЙ ЦЫРЫМОНІІ «ЗОРНЫ МЯЧ»

Вынікі футбольнага сезона падведзены, а спецыяльныя прызы, статуэткі і сертыфікаты знайшлі сваіх уладальнікаў. Сапраўдным трыумфатарам вечара стаў Сяргей Крывец, якога прызналі лепшым паўабаронцам чэмпіянату і лепшым футбалістам краіны. Акрамя гэтага, паўабаронца нацыянальнай зборнай і французскага клуба «Мец» атрымаў спецыяльныя прызы «За футбольны талент і самааддачу ў гульні за Беларусь» і «Самы карысны гулец «Беларусбанк — чэмпіянату Рэспублікі Беларусь сезона 2014 сярод камандаў вышэйшай лігі». Сам футбаліст не змог прысутнічаць на цырымоніі з-за занятасці ў «Мецы», таму па прызы на сцэну ўзнімаўся яго бацька Вячаслаў Крывец.

**Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ.**

**Пераможцы ў астатніх намінацыях:**

**Лепшы варатар чэмпіянату —** Артур Катэнка («Шахцёр», Салігорск).
**Лепшы абаронца чэмпіянату —** Ягор Філіпенка (БАТЭ, Барысаў)
**Лепшы нападаючы чэмпіянату —** Міхаіл Гардзейчук (БАТЭ, Барысаў).
**Лепшы бамбардзір чэмпіянату —** Мікалай Януш («Шахцёр», Салігорск).
**Лепшы футбаліст чэмпіянату —** Ігар Стасевіч (БАТЭ, Барысаў).
**Лепшы трэнер Рэспублікі Беларусь —** Віктар Ганчарэнка.

Фота Надзеі БУЖАН.

Лепшым трэнерам прызналі Віктара Ганчарэнку.

Ігар Стасевіч стаў лепшым гульцом чэмпіянату.

Замест Сяргея Крыўца прыз атрымаў яго бацька Вячаслаў.

■ Падводзім вынікі

# РЫСЫ ФУТБОЛЬНАГА ГОДА

**Чарговая перамога БАТЭ ў чэмпіянаце, фіяска ў Лізе чэмпіёнаў, незразумелая гульня зборнай і абмен беларускіх трэнераў у Краснадары. Напрыканцы года «Звязда» вырашыла скласці свой рэйтынг футбольных падзей.**

**1. Барысаўскі БАТЭ 11-ы раз стаў чэмпіёнам краіны па футболе.** Сёлетні чэмпіянат для нашага гегемона атрымаўся самым цяжкім у параўнанні з мінулымі першынствамі. Наўрад ці ў сярэдзіне турнірнай дыстанцыі нехта мог з упэўненасцю заявіць, што барысаўчане здолеюць заваяваць чарговыя залатыя медалі. Мінскае «Дынама» навязала «жоўта-блакітным» сапраўды добрую канкурэнцыю. Але менавіта БАТЭ здолеў больш роўна правесці завяршальны этап чэмпіянату і ў выніку атрымаць чарговую перамогу. Варта адзначыць, што 11 па ліку чэмпіёнства барысаўчане кавалі на новым стадыёне. У маі афіцыйна адкрылася 13-тысячная «Барысаў-Арэна». На ёй свае хатнія матчы праводзіць не толькі БАТЭ, але і зборная Беларусі. Гэта гучыць парадаксальна, але ў Мінску пакуль няма стадыёна, на якім можна праводзіць матчы высокага міжнароднага ўзроўню.

**2. Калі ў родным першынстве барысаўчане здолелі выканаць пастаўленыя задачы, у Лізе чэмпіёнаў яны… устанавілі антырэкорд.** Наша каманда прапусціла больш за ўсіх (24 галы) у групавой стадыі лігі за ўвесь час правядзення спаборніцтваў. Раней па 22 разы прапускалі харвацкае «Дынама» і дацкі «Нордшэланд». Праблемы ў еўракубках у барысаўчан з'явіліся яшчэ на кваліфікацыйнай стадыі, але каманда ўсё ж такі здолела пераадолець бар'ер у выглядзе албанскага «Шкендэрбеу», венгерскага «Дэбрэцэна» і славацкага «Слована». Аднак на групавым этапе БАТЭ быў літаральна знішчаны данецкім «Шахцёрам» (0:7, 0:5), партугальскім «Порту» (0:6, 0:3). Барацьбу за трэцяе месца, якое давала магчымасць прадоўжыць выступленні ў Лізе Еўропы, падапечныя Аляксандра Ермаковіча вялі з іспанскім «Атлетыкам». Аднойчы перамаглі, але ўсё роўна завяршылі турнір на апошнім месцы.

**3. Перамога над «Фіярэнцінай» — галоўнае дасягненне мінскага «Дынама» ў сёлетнім розыгрышы Лігі Еўропы.** Так, чэмпіёнскую гонку Мінск Барысаву саступіў, але сваім балельшчыкам гульцы «Дынама» падарылі сапраўдную еўракубкавую восень. «Дынамаўцы» ўпершыню ў сваёй гісторыі згулялі ў групавой стадыі Лігі Еўропы. Дасягненне, якім і футбалістам, і трэнерскаму штабу сапраўды ганарыцца трэба. Са сваёй групы беларусы, у якой ім супрацьстаялі грэчаскі ПАОК, французскі «Генгам» і італьянская «Фіярэнціна», так і не выйшлі, але здолелі стварыць маленькую сенсацыю. У апошнім туры Ігар Стасевіч і кампанія ў Фларэнцыі перамаглі мясцовую «Фіярэнціну» 2:1. Вінчэнца Мантэла, славуты ў мінулым футбаліст, а сёння галоўны трэнер фларэнційцаў, пасля гэтай сустрэчы прызнаўся, што яму сорамна за вынік, за гульню. Такі вось невялічкі ўдар па рэпутацыі вядомай італьянскай каманды.

Цікава, што яшчэ задоўга да сустрэчы ў прэсе з'явілася пагалоска аб тым, што пасля сезона пасаду галоўнага трэнера «Дынама» пакіне Уладзімір Журавель. СМІ ўжо нават называюць наступніка Жураўля. На гэтую пасаду актыўна «сватаюць» Юрыя Максімава, вядомага ўкраінскага футбаліста, які да нядаўняга часу ўзначальваў расійскую «Мардовію».

**4. На нашу думку, жодзінскае «Тарпеда» — адкрыццё чэмпіянату. Сёлета выдатна сябе ў еўракубках праявіў салігорскі «Шахцёр».** Хлопцы Сяргея Бароўскага дайшлі да раўнда плэй-оф, дзе саступілі больш рэйтынгаваму галандскаму ПСВ. У чэмпіянаце «гарнякі» зноў прэтэндавалі на медалі, але здолелі ўскочыць на трэцюю прыступку п'едэстала на апошніх хвілінах матча з

БАТЭ. І калі б салігарчане ў апошнім туры не зраўнялі лік у сустрэчы з дружынай Анатоля Капскага, быць бы ім за межамі медалёвай тройкі. У гэтым выпадку свята магло б прыйсці ў аўтаград — да жодзінскага «Тарпеда». Белазаўская каманда яшчэ ніколі не была ў прызёрах. І, шчыра кажучы, першы этап першынства наўрад ці даў жодзінскім заўзятарам моманты для аптымізму. А тут яшчэ з'явіліся праблемы з выплатай заробкаў футбалістам, якія, безумоўна, пазітыўна на гульню паўплываць не змаглі. Нягледзячы на гэта «чорна-белыя» правялі фенаменальную канцоўку, якая дазволіла прэтэндаваць на бронзавыя ўзнагароды. Апошні матч чэмпіянату супраць навапалацкага «Нафтана» наогул ператварыўся ў сапраўдную драму. Жодзінцы ўпэўнена вялі сустрэчу да перамогі, балельшчыкі ў эйфарыі ўжо рыхтаваліся ісці «замочваць» медалі, але гол Мікалая Януша ў вароты БАТЭ ацвярозіў прысутных на стадыёне «Тарпеда». Жодзінская каманда чацвёрты раз заняла чацвёртае месца ў чэмпіянатах краіны.

**5. Беларусь перамагла Мексіку.** Наша нацыянальная зборная завяршыла год на мажорнай ноце перамогай у таварыскай сустрэчы над мексіканцамі (2:1). Магчыма гэта і так, але вынік галоўнай каманды ў кваліфікацыі першынства Еўропы — правальны. Беларусь згуляла ўнічыю з Люксембургам, саступіла па чарзе Украіне, Славакіі і Іспаніі. Георгій Кандрацьеў, які збіраўся пабудаваць новую зборную, як відаць, нічога ў плане выніку не дасягнуў і быў адпраўлены ў адстаўку. У матчы з Мексікай камандай кіраваў Андрэй Зыгмантовіч, асістэнт Кандрацьева, а ўжо пасля федэрацыя абрала новага трэнера. Хадзілі чуткі, што сярод кандыдатаў на гэтую пасаду былі Дыега Марадона, Джавані Трапатоні, а перамог беларус, былы трэнер рэзервістаў кіеўскага «Дынама» Аляксандр Хацкевіч.

**6. Лепшым футбалістам краіны прызналі Сяргея Крыўца.** Добрую частку сезона Крывец правёў у БАТЭ, але нечакана для многіх падпісаў кантракт з «Мецам», клубам элітнага французскага дывізіёна. На новым месцы Сяргей доўга не разварушваўся, амаль адразу пачаў радаваць балельшчыкаў галамі і галявымі перадачамі. На снежань 2014 года Крывец з'яўляецца адзіным прадстаўніком Беларусі ў элітным футбольным чэмпіянаце, а таму прызнанне Сяргея — цалкам заслужанае.

**7. А вось лепшым айчынным трэнерам выбралі Віктара Ганчарэнку.** Былы трэнер БАТЭ няблага працаваў з краснадарскай «Кубанню», але стаў ахвярай дзіўных рашэнняў кіраўнікоў клуба. Каманда знаходзілася ў верхняй частцы турнірнай табліцы, аднак босаў «Кубані» не задавальняла мяккасць Ганчарэнкі ў кантакце з гульцамі. Больш абсурднай версіі для звальнення трэнера пры неблагіх паказчыках і не прыдумаць. Цікава, што новым «коўчам» «Кубані» прызначылі яшчэ аднаго беларуса — Леаніда Кучука, былога трэнера маскоўскага «Лакаматыва», які калісьці ўжо трэніраваў краснадарцаў. А вось яшчэ аднаго беларускага футбольнага спецыяліста Алега Кубарава малдаўскія аматары ў апытанні на футбольным інтэрнэт-партале прызналі лепшым трэнерам года. А вось тамтэйшая футбольная федэрацыя поспехі клуба і трэнера праігнаравала і ўзнагародзіла зусім іншага чалавека. Былы трэнер жодзінскага «Тарпеда» і «Гомеля» ўзначаліў «Зімбру» ў верасні 2013-га. Пры ім кішынёўцы заваявалі Кубак і Суперкубак Малдовы, а ў Лізе Еўропы, як і наш «Шахцёр», дайшлі да раўнда плэй-оф. Для каманды гэта неверагодны поспех. Праўда, дагуляць гэты сезон пад кіраўніцтвам Кубарава «Зімбру» не наканавана. З-за праблем наш спецыяліст разам з вялікай колькасцю футбалістаў пакінуў калектыў.

**Тарас ШЧЫРЫ. Фота аўтара.**

■ Трымай удар!

# У СКАРБОНЦЫ БЕЛАРУСАЎ 6 ЗАЛАТЫХ МЕДАЛЁЎ

**У Мінску адбыўся адкрыты Кубак СНД — Кубак свету па таэквандо ITF. У выніку за тры дні спаборніцтваў беларускія спартсмены заваявалі 36 узнагарод, сярод якіх 6 — залатых! 4 з іх — у мінскіх спартсменаў.**

Напэўна, далёка не кожны ведае, што і ў такім дынамічным спорце, як таэквандо, існуе дзве версіі. У сталіцы Беларусі спаборнічалі якраз у неалімпійскай дысцыпліне. Але ў чым адрозненне?

— У нашай версіі, акрамя ўдараў нагамі, можна выкарыстоўваць удары рукамі, — кажа Фахрэддзін Умараў, старшы суддзя на дыване. — Атрымліваецца кантактнае і вельмі відовішчнае адзінаборства.

Агулам за 200 камплектаў узнагарод на веладроме «Мінск-Арэны» змагаліся каля 1200 спартсменаў з 13 краін ва ўзросце ад 7 да 39 гадоў. У камандным заліку вікторыю святкавалі прадстаўнікі Кіева. На другім і трэцім радках апынуліся каманды з Масквы і Санкт-Пецярбурга.

— Па вялікім рахунку, умовы і сама зала, дзе адбываліся спаборніцтвы, мне спадабаліся, — прызнаецца ўкраінскі таэквандзіст Дзмітрый Слынько. — Спаборніцтвы даволі якасныя ў плане падбору спартсменаў. Тут выступаюць шмат моцных таэквандзістаў з Расіі, Таджыкістана, Украіны, змагацца з якімі даволі цікава. Перамога даецца нялёгка. Трэба будзе абавязкова яшчэ раз прыехаць на спаборніцтвы ў Мінск.

— Апошнія 7 гадоў нашы спартсмены ўдзельнічаюць ва ўсіх буйных міжнародных спаборніцтвах, — падкрэслівае Уладзіслаў Бержац, трэнер юніёрскай зборнай Беларусі. — Для нашай краіны гэта даволі малады від спорту, але мы ўжо дагналі тыя краіны, у якіх ён развіваецца 30 гадоў. Рухаемся ў правільным кірунку.

**Тарас ШЧЫРЫ. Фота аўтара**

■ Дайджэст

# Бразільскія талісманы сыграюць у тэлесерыяле

## ЧЫМ ЖЫЎ АЛІМПІЙСКІ РУХ У СНЕЖНІ?

**1. Зборныя вобразы бразільскай фаўны і флоры сталі талісманамі Алімпіяды і Паралімпіяды,** якія пройдуць у 2016 годзе ў Рыа-дэ-Жанейра. Сімвал бразільскай фаўны чымсьці нагадвае ката, а флора прадстаўлена сіне-зялёным талісманам, у якім можна пабачыць рысы звычайнай пальмы. Мянушкі адным з галоўных герояў Гульняў ужо прыдумалі — Вінісіус і Том. Гэтыя імёны былі выбраны ў гонар вядомых бразільскіх кампазітараў Вінісіуса дзі Марайса і Тома Жабіма.

Гэтых веселуноў назвалі ў гонар вядомых бразільскіх музыкаў.

Арганізатары Алімпіяды плануюць выставіць на рынак 12 тысяч тавараў з алімпійскай сімволікай і выручыць каля 400 млн долараў. А каб зацікавіць Гульнямі маладзёжную аўдыторыю, за год да старту Алімпіяды на бразільскім тэлебачанні пакажуць серыял з удзелам талісманаў.

**2. Нацыянальны алімпійскі камітэт Косава прынялі ў алімпійскую сям'ю.** Гэтая падзея стала галоўнай на 127-й сесіі Міжнароднага алімпійскага камітэта. Сербія рэзка асудзіла дзеянні МАК, спаслаўшыся на тое, што ў далейшым будзе складана захаваць прынцыпы спорту пасля прыняцця «такога палітычна матываванага рашэння, якое стварыла прэцэдэнт».

Цяпер косаўскія спартсмены змогуць прыняць удзел у Алімпіядзе-2016. Сёння ў склад НАК Косава, створанага ў 1992 годзе, уваходзіць больш за трыццаць федэрацый па розных відах спорту, трынаццаць з якіх з'яўляюцца алімпійскімі. А яшчэ шэсць з іх — паўнавартасныя члены міжнародных федэрацый. Падкрэслім, што рашэнне аб прыняцці Косава ў МАК было аднагалосным.

**3. Румынскі Брашаў альбо швейцарская Лазана прымуць трэція зімовыя юнацкія Алімпійскія гульні 2020 года.** Пасля чарговай сесіі МАК менавіта гэтыя гарады засталіся ў шорт-лісце. Ацэначная камісія будзе працягваць не толькі разглядаць абодва праекты, але і праводзіць відэаканферэнцыі з прадстаўнікамі арганізацыйных камітэтаў абодвух гарадоў-кандыдатаў. Пасля чаго на 128-й сесіі МАК, якая адбудзецца ў ліпені 2015 года ў Куала-Лумпуры, будзе выбарана сталіца зімовай юнацкай Алімпіяды-2020. Адзначым, што бліжэйшыя зімовыя юнацкія Гульні пройдуць у нарвежскім Лілехамеры ў 2016 годзе, а Буэнас-Айрэс прыме летнюю юнацкую Алімпіяду-2018.

**Падрыхтавала Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ**